# ІДЭЯ БЕЛАРУСКАСЦІ І ІДЭЯ ПОЛЬСКАСЦІ НА МЯЖЫ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ



Уладзімір Конан (Мінск)

## Беларусь на мяжы тысячагоддзяў: штрыхі да гістарычнага, палітычнага і духоўнага партрэта нацыі

Нямецкі пісьменнік швейцарскага паходжання Герман Гесэ ў 1920-я гг. напрарочыў масавае спрашчэнне культуры, выцясненне элітарнай кампетэнтнасці так званым *фельетонным стылем.* Але першым прарокам тут быў расійскі геній украінскага паходжання Мікалай Гогаль: гэта ён стварыў неўміручы вобраз Хлестакова, што хваліўся незвычайнай лёгкасцю сваіх думак і пачуццяў. Тады хлестакоўшчына прыжылася на бытавым і службова-бюракратычным узроўнях, нядрэнна пачувалася ў асяроддзі напаўсвецкіх салонаў. Г. Гесэ разгледзеў яе на газетна-часопіснай балбатні свайго часу. Але абодвум, здаецца, і не снілася такое паніжэнне масавай літаратуры, кінематографа, найбольш так званых мас-медыа на тэле-электронных паверхах. Там хлестакоўшчына, нярэдка банальная правакацыя і прагматычна разлічаны на пэўную аўдыторыю паклёп (напрыклад, ачарненне апазіцыі на «беларускім» тэлебачанні), сталі модай, адсунулі прафесіянальную навуку, нацыянальную культуру, сумленнае мастацтва, прыстойную палітыку, нават эканоміку далёка за авансцэну.

На зыходзе XX ст. аб'ектам палітычных эксперыментаў і мэтанакіраванай кампраметацыі стала наша бацькаўшчына Беларусь. Яе «скубуць» суседзі з двух бакоў, Усходні Вучоны і Заходні Вучоны. Пачынаючы ад нейкіх элітарных тусовак з удзелам лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі да бульварных пісак і

тэлевізійных балбатуноў. Горка ад таго, што да гэтай кампаніі шальмавання Беларусі падключыліся некаторыя мясцовыя «маладыя» (гадкоў пад сорак) літаратары, навукоўцы і асобы невядомай прафесіі. Незалежна ад палітычнай арыентацыі: ад чарнасоценцаў і бальшавіцкіх артадоксаў да ліберралаў еўрапейскай арыентацыі.

Да гэтай дыскрэдытацыі беларускай ідэі прычынілася сучасная адсутнасць строгай, лагічна выверанай этналагічнай навукі. Сучасная этналогія на ўзроўні масавай культуры — гэта збор выпадковых эмпірычных фактаў, лёгкаважкіх гіпотэзаў, замешаных на палітычных міфах. На жаль, не толькі ў палітыцы, але таксама ў акадэмічнай і універсітэцкай навуцы блытаюць этнічнае паходжанне з нацыянальнай прыналежнасцю. Між тым, этнас ёсць гістарычна дэтэрмінаваны сінтэз прыроднага і сацыяльнага быцця народа, адзінства генетычна зададзенай антрапалагічнай фармацыі і такога ж аб'ектыўнага у=сябе=быцця (паводле Гегеля), у тым ліку гістарычна дэтэрмінаванай этнічнай культуры. Уключаючы народную мову ў шматграннасці яе рэгіянальных дыялектаў. Нацыя ёсць *самаўсведамленне народа*, аб'ектызаванае ў *культурнай традыцыі і актуальнай духоўнай творчасці.* Прысутнасць чалавека ў нацыі ёсць яго быццё ў кантэксце нацыянальнай культуры. Нацыянальная прыналежнасць ёсць вынік *свабоднага выбару.* Этнас ёсць прычына, нацыя — вынік, этнас — гэта карані і ствол дрэва, нацыя — яго крона, квітненне і плён. Няма абсалютнай тоеснасці паміж чалавекам этнічным і чалавекам нацыянальным. Для прыкладу, да беларускай нацыі *рэальна* належаць толькі нацыянальна ўсвядомленыя беларусы, а таксама прадстаўнікі этнічных меншасцяў, якія жывуць у кантэксце беларускай мовы і культуры. Тыя ж этнічныя беларусы, якія не ўсвядомілі сябе беларусамі і аб'ектыўна не жывуць у кантэксце беларускай нацыянальнай мовы і культуры, актуальна выпадаюць з нацыі, іх прыналежнасць да яе — толькі *эвентуальная,* гэта значыць, толькі магчымая пры пэўных сацыяльна-палітычных умовах. У гэтым асяроддзі ёсць рэзервы беларускасці. Бо фарысей і вораг хрысціянства Саўл можа стаць апосталам Паўлам. Але — не наадварот.

Такая ж банальная памылка ўзнікае тады, калі беларуская нацыя атаясамліваецца з усімі насельнікамі Беларусі. Тут роля іншаэтнічных груповак неадназначная. Калі яны ўключаюцца ў моўна-культурны кантэкст тытульнай нацыі, тады гэтая роля творчая, канструктыўная. Калі ж яны займаюць варожую

пазіцыю да гэтага культурна-нацыянальнага кантэксту, тады іхняя роля разбуральная. Бывае і так, што іншанацыянальныя меншасці жывуць замкнутай абшчынай, тады іхняя пазіцыя да нацыі нейтральная.

Мне могуць запярэчыць, што такое кантраснае размежаванне нацыянальнай структуры насельніцтва не адпавядае вопыту нацыянальнай кансалідацыі еўрапейскіх дзяржаваў і ў Злучаных Штатах Амерыкі (ЗША). Трэба пагадзіцца, што гэта сапраўды так. Але такая супярэчнасць тлумачыцца неаднолькавым гістарычным лёсам розных нацыяў. У Еўропе і ЗША ўнутраныя і вонкавыя фактары спрыялі нацыянальнай кансалідацыі; у Беларусі яны дзейнічалі ў кірунку перыядычнага разбурэння этнасу і нацыі. Напомню толькі пра апакаліптычныя катастрофы, не закранаючы частых ваенных рабункаў, пачынаючы ад настойлівых спроб ліквідаваць незалежнае Полацкае, Наваградскае княствы, пазней Вялікае Княства Літоўскае — гэтыя правобразы дзяржаўнай Беларусі.

Вынікам расійскай агрэсіі 1654–1667 гг. у Беларусі стала дэмаграфічная і сацыяльна-эканамічная катастрофа. Паводле дакладных падлікаў гісторыкаў (Г. Сагановіч, У. Арлоў і інш.) быў загублены або вывезены ў палон кожны другі жыхар Беларусі, колькасць насельніцтва скарацілася на 55%, у асобных гарадах — ад 70 да 90% параўнальна з даваенным часам. Агульная колькасць насельніцтва скарацілася з 2 мільёнаў 900 тысяч да вайны да 1 мільёна 350 тысяч пасля вайны. Рэха гэтай катастрофы чулася ў канцы XIX – пачатку XX ст.: беларускія гарады і мястэчкі страцілі прыкметы беларускасці. Карэннае насельніцтва там складала 10–15 працэнтаў, да таго ж аказалася амаль поўнасцю выцесненае з ключавых пазіцый эканомікі, сацыяльна-палітычных структур і функцыянальных відаў культурнай дзейнасці. Такая сітуацыя аблягчыла расійскаму царызму татальную дэнацыяналізацыю Беларусі. Яна забараніла нават яе ўласнае імя. Пра тое, што Беларусь жыве і мае сваю родную мову, не горшую, чым расійская, польская, французская, Ф. Багушэвіч сказаў толькі за межамі імперыі — у кракаўскім выданні сваёй паэтычнай кнігі «Дудка беларуская» (1891).

Сённяшнія лібералы — маладыя і сталага веку — апошнім часам ахвотна высмейваюць «беларускі менталітэт», і нават беларускае нацыянальнае Адраджэнне, не беручы пад увагу гістарычны лёс краіны і дэнацыяналізаваны характар сучасных структур, дзе беларуская нацыянальная эліта амаль поўнасцю адхілена ад кіравання эканомікай, культурай, а найбольш — ад

усіх «паверхаў» дзяржаўнай улады. Беларусь фактычна засталася адстойнікам былой Расійскай імперыі і Савецкага Саюза.

Дарэчы будзе параўнанне «цёмнай» і «бязвольнай» Беларусі (такой яна бачыцца псеўдадэмакратам featureа узроўню) з Амерыкай (ЗША), якую выдаюць, магчыма, не без падстаў за ўзор сучаснай дэмакратыі. Як вядома, амерыканскае грамадства фарміравалася як англійская калонія. У XVI–XVIII стст. там утваралася моцнае англа-сакскае этнічнае ядро, з яго выдзелілася энергічная эліта ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, адцясніўшы абарыгенаў на маргінальны ўзровень нейкага вялізнага этнаграфічнага музея. Шматнацыянальныя эміграцыйныя хвалі паглыналіся гэтым англа-сакскім уладным ядром. У яго катле пераварыліся мільёны гвалтоўна вывезеных з Афрыкі неграў, былых рабоў Новай гісторыі. Іншая справа, што гэтае ядро па прычыне сваёй этнічнай неаднароднасці ў перспектыве можа ўзарвацца, выклікаўшы татальны крызіс амерыканскай фінансавай імперыі. Але гэта — асобная і далікатная праблема: пакінем яе для амерыканскіх даследчыкаў.

Тут жа прывяду толькі адзін прыклад таго, як нялёгка было натуралізавацца ў ЗША, набыць там права грамадзяніна нават самым выбраным эмігрантам. У 1922 г. бальшавікі выслалі з Расіі слаўных дзеячаў рускай культуры. Сярод іх былі выдатныя філосафы і асветнікі Мікалай Бярдзяеў і беларускі шляхціч паводле радаводу Мікалай Лоскі (1870–1965), які аднак называўся «рускім польскага паходжання». За мяжой М. Лоскі набыў сусветную вядомасць як адзін з заснавальнікаў інтуітывізму і персаналізму ў еўрапейскай філасофіі. Служыў прафесарам у Празе, Браціславе, Парыжы. У 1946 г. пераехаў у ЗША па запрашэнню Стэфардскага універсітэта і Рускай духоўнай акадэміі. Праз пяць гадоў выпрабавальнага тэрміну яму дазволілі здаць строгі экзамен на права называць сябе амерыканскім грамадзянінам. Давялося здаваць залікі па англійскай мове, Канстытуцыі краіны і амерыканскаму патрыятызму. Між тым М. Лоскі тады ўжо чытаў лекцыі па-англійску і апублікаваў брашуру — тлумачэнне Канстытуцыі ЗША. Па курсу нацыянальнай свядомасці яму было зададзена цікавае пытанне: Які ўклад у абарону краіны Вы зробіце ў выпадку ваеннага канфлікту ЗША з іншай краінай альбо кааліцыяй? М. Лоскаму тады было 80 гадоў. Славуты філосаф адказаў, што яшчэ мог бы паслужыць у прапагандысцкім аддзеле амерыканскай арміі.

А цяпер рытарычнае пытанне да тых, хто абражае Беларусь і беларусаў. Як фарміравалася беларускае «нацыянальнае»

грамадства ў цяперашняй Беларусі? Дастаткова сказаць, што «патрыётамі» тут называюць сябе ненавіснікі беларускай мовы, незалежнай беларускай дзяржавы, ганіцелі былых і сучасных пакутнікаў за Беларусь называюць іх *нацыяналістамі,* укладваючы ў гэтае паняцце адваротны яму сэнс. Пры гэтым сарамліва замоўчваецца галоўны гвалтаўнік ад першых цывілізацый да канца нашага стагоддзя — імперыялізм. Наўмысна забываецца аб'ектыўная семантыка гэтых слоў, яны міфалагізуюцца. Паняццю *нацыяналізм* надаюць адмоўнае значэнне ў сэнсе варожасці да іншых нацый і агрэсіўнасць. Між тым, *нацыяналізм* суадносіцца з адваротным яму *касмапалітызмам* і абодвы заключаюць пазітыўны, пераважна сацыяльна-псіхалагічны і духоўна-культурны сэнс. Нацыяналіст — гэта той, хто камфортна адчувае сябе ў сваёй краіне і ў кантэксце сваёй нацыянальнай культуры; касмапаліт (грэчаскае *kosmopolites* — грамадзянін свету) камфортна жыве ў любой іншай краіне. Тоеснасць паміж нацыяналізмам і патрыятызмам толькі адносная. Можна любіць сваю нацыю, а праз яе ўсе іншыя нацыі; можна любіць *імперскую айчыну*, а такі патрыятызм блізкі да імперыялізму, які, дарэчы, прычына ўсіх вядомых захопніцкіх войнаў — ад асірыйскага цара Аршурпаліпала і вавілонскага Навухаданосара да Сталіна і Гітлера. Дарэчы, гітлераўскі фашызм ёсць спроба аднавіць і павялічыць былую Германскую імперыю. Гітлер і яго нацыянал-сацыялісты былі імперыялістамі, а не нацыяналістамі. Агульнавядомая заява Гітлера ў канцы вайны. Сэнс яе такі: калі нямецкая нацыя не пераможа, не ўтрымае аднаўленую германскую імперыю, то яна нявартая свайго фюрэра і *павінна загінуць.*

Імперыяліст і шавініст Гітлер памыліўся: Германія ў вайне згубіла імперыю, а ў дадатак — вялікія абшары ўласнай тэрыторыі (Прусію, Памор'е). Затое кансалідавалася як нацыя і сёння жыве на некалькі парадкаў вышэй, чым яе ўсходнія пераможцы, якія занялі частку нямецкай тэрыторыі.

Пяройдзем, аднак, да беларускай ідэі, гэта значыць да Беларусі ў яе трох вымярэннях — мінуўшчыны, сучаснасці і будучыні. Сёння некаторыя самадзейныя гісторыкі, палітолагі, публіцысты, айчынныя і замежныя, стварылі фальшывы партрэт Беларусі. Паводле іх малявідлаў, Беларусь і беларусы — нешта маргінальнае, пазбаўленае нацыянальнай і грамадзянскай самасвядомасці; негістарычнае, штучна створанае бальшавікамі або выпадкова набыўшае дзяржаўнасць пасля распаду савецкай імперыі. Нават паводле некаторых сур'ёзных навукоўцаў, —

сваіх, расійскіх, польскіх, нямецкіх і яшчэ нейкіх — беларусы быццам бы не дараслі да сучаснай нацыі, быццам бы беларуская нацыя недаразвітая, нават праблематычная; а беларусы — нешта накшталт Вечнага Жыда, бяздомных яўрэяў, пазбаўленых сваёй айчыны.

Апошнім часам у псеўданавуковых опусах і на ўзроўні «фельетоннай культуры» з'явілася мода залічваць беларусаў да *жаночай нацыі*, пазбаўленай уласнае творчае волі і здольнай толькі на ролю этнаграфічнага матэрыялу для геапалітычных і культурных інтарэсаў моцных, *мужчынскіх* нацый. Відаць, аўтары гэтага дрэннага міфа чулі пра кнігу О. Вейнінгера «Пол і характар», дзе ўпершыню абгрунтоўваецца такая тыпалогія. Але па ляноце не разгледзелі сутнасці ягонай канцэпцыі, паводле якой беларусы хутчэй за ўсё былі б залічаны да *рыцарскай* нацыі.

Я мог бы спаслацца на шмат прыкладаў гэтай псеўданавукі , прывяду толькі адзін — зачын артыкула нямецкага палітолага Астрыд Зам, з якім мне ўжо прыходзілася палемізаваць у часопісе «Нёман». Вось яе словы: «Белорусы никогда не были организованной и общепризнанной нацией. Самостоятельного белорусского государства не существовало вплоть до XX-го столетия. Террритория сегодняшней Беларуси попеременно входила в состав Великого Княжества Литовского, Польского Королевства, а также царской России, и вследствие этого была областью различных политических и культурных напластований» [1] .

Наіўнасць А. Зам анекдатычная: аказваецца Беларусь уваходзіла як тэрыторыя ў склад самой сябе — Вялікага Княства Літоўскага, якое заснавалі і ўзвялічылі да сваёй магутнай дзяржавы якраз беларусы. Беларусь тут не ўваходзіла, а была гэтым Княствам. Каб я быў такі ж наіўны ў гісторыі, як гэтая нямецкая дама, верагодна, добрая ва ўсіх адносінах, апрача свае «навукі», то мог бы сказаць: да аб'яднання Германіі ў другой палове XIX ст. не было германскай нацыі і дзяржавы; не было таксама Італіі да вызвольнай вайны і аб'яднання асобных гарадоў і княстваў; не было і Расіі да Пятра І, бо раней на тым месцы існавала спачатку Маскоўскае княства, а пасля Маскоўскае царства.

Справа аднак не ў назве, а ў той субстанцыі, якая хаваецца пад рознымі назвамі. Як кажуць у народзе: *назаві хоць гаршком, толькі ў печ не стаў*. У даным выпадку маецца на ўвазе не гаршчок, а гіганцкі імперскі кацёл, у якім спрадвеку перамешваліся народы і нацыі ў нейкія хімерныя этнасы.

Цяпер паспрабуем на падставе гэтага негатыву выявіць пазітыўны партрэт Беларусі і беларускай нацыі. Не намінальна (па найменню), а рэальна беларускі этнас сфарміраваўся ў V–X стст., а беларуская дзяржава і развітая ультура пачаліся ў эпоху Сярэднявякоўя (IX–XV). У гістарычным развіцці яна прайшла ўсе агульнаеўрапейскія культурна-гістарычныя тыпы і стылі — рэнесанс, барока, класіцызм, рамантызм, эклектызм, мадэрнізм. У другой палове XIX – першай чвэрці XX ст. беларусы стварылі сваю класічную літаратуру. Тады ж закончылася станаўленне самабытнай нацыянальнай школы ў прафесійным мастацтве асноўных відаў і жанраў.

Дарэчы, Адам Міцкевіч у сваіх парыжскіх «Лекцыях пра славянскія літаратуры» (1840–1843) на самым пачатку адраджэння нашага прыгожага пісьменства казаў пра беларускую мову, што яна ўзнікла даўно і цудоўна распрацаваная. А гэта, рабіў выснову геній з Наваградчыны, сведчыць пра гістарычнасць нацыі і духоўную вышыню народа. Стварэнне за адносна кароткі час (канец XIX – 1920-я гады) нашай класічнай літаратуры бліскуча пацвердзіла прароцтва А. Міцкевіча.

Іншая справа — гістарычны лёс народаў, якім было наканавана выжываць у атачэнні агрэсіўных імперыяў. Тут была б дарэчы аналогія Беларусі з Ізраільскім царствам біблейскай эпохі, а не з сучаснай Еўропай і ЗША. Заціснутая паміж вялікімі імперыямі дзяржава дванаццаці ізраільскіх каленаў (рода-племянных саюзаў) пасля шматкратных расцярушванняў карэннага народа і засялення яго зямлі запаветнай іншаэтнічнымі масамі прывяло ў рэшце рэшт да знікнення палітычна кансалідаванай і лакалізаванай на сваёй айкумене ізраільскай нацыі. На месцы былой нацыянальнай дзяржавы ўзнікла калонія Галілея, сфарміраваўся хімерны субэтнас *самаране* са «сталіцай» Самарыя. Адраджэнне яўрэйскай нацыі адбываецца толькі пасля ўтварэння Ізраільскай дзяржавы на спрадвечнай прарадзіме гэтага народа.

Сучасная Галілея — Беларусь знаходзіцца на мяжы гэтай этна-нацыянальнай мутацыі, хоць пакуль што не пераступіла яе, бо захавала, праўда, моцна разбуранае беларускае этнічнае ядро і нацыянальную эліту.

Ва ўсе гістарычныя эпохі стратэгія імперскіх заваёўнікаў была аднолькавая, адрозніваласяя толькі метадамі — ад першабытных (татальнае знішчэнне здольных да зброі мужчын, палон і асіміляцыя жанчын і дзяцей) да сучасных «ліберальных» формаў дэстабілізацыі (разбурэнне этнічнага ядра нацыі шляхам

расцярушвання народа на прасторах імперыі, подкупу дэнацыяналізаванай часткі эліты і фарміравання хімерных субэтнасаў). Беларусы захавалі ядро нацыі, перажыўшы *ваенны патоп* і дэмаграфічную катастрофу 1654–1667 гг., паланізацыю сацыяльнай эліты другой паловы XVII–XVIII ст., адкрытую русіфікацыю XIX – пачатку XX ст. Але моцна надарваліся ў дзесяцігоддзі прымусовай бальшавіцкай індустрыялізацыі і рабскай калектывізацыі, татальнага вынішчэння нацыянальнай эліты ў гады сталінскіх рэпрэсій.

Беларусы разам з украінцамі, літоўцамі і палякамі перажылі тры раздзелы іхняй канфедэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай паміж трыма суседнімі імперыямі ў 1772–1795 гг. Расійскі ўрад і афіцыйнае рускае грамадства не хавала сваёй геапалітычнай стратэгіі: падавіць беларускі і ўкраінскі рух да самастойных нацый, дэфармаваць іх аж да ўзроўню субэтнасаў «адзінага рускага народа» з адзінай вялікарускай мовай і культурай, а палякаў і літоўцаў «даціснуць» да ўзроўню васальных народаў (у Рымскай імперыі іх неяк здзекліва называлі саюзнікамі). Палякі перажывалі тады сваю нацыянальную драму, беларусы — сваю трагедыю з магчымым *лятальным* фіналам.

Ужо той факт, што беларусы тады выжылі, захавалі чысціню роднае мовы, стварылі класічную літаратуру, а пасля першага распаду Расійскай імперыі ў 1917–1918 гг. адрадзілі сваю дзяржаву (дарэчы, адначасова з палякамі) сведчыць пра мужны, рыцарскі характар беларускай нацыі. За яе сведчыць сама гісторыя: наяўнасць у яе моцнага шляхецкага саслоўя і рыцарскіх замкаў, руіны якіх захаваліся па ўсёй краіне. І калі нехта па наіўнасці, няведанню або злой волі сёння балбоча пра «недаразвітасць» беларускай нацыі, то я напомню: так жа ў 1920-я гады глядзелі на палякаў. Як засведчыў Уладзімір Маякоўскі ў вершы пра савецкі пашпарт: «На польский — глядят, как в афишу коза. // На польский — выпяливают глаза // в тугой полицейской слоновости — // Откуда, мол, и что это за // географические новости?» А між тым за Польшчу ваявала (хоць пераважна ідэалагічнай зброяй, але Напалеон — і ваеннай зброяй) амаль ці не ўся Еўропа аж да Рыжскай дамовы Савецкай Расіі з Польшчай 1921 года.

У заключэнне паразважаем пра будучыню Беларусі. Памыляюцца (а можа нехта хлусіць!), калі сцвярджаюць, быццам бы наша нацыя «недаразвітая» і не перспектыўная. Яна моцна дэфармаваная вонкавымі, імперскімі сіламі, асабліва ў складзе былой атэістычнай імперыі. Бальшавікі праводзілі нябачаны

ў ранейшай гісторыі генацыд, найбольш — беларусаў і ўкраінцаў. У параўнанні з гэтым злачынствам супраць «свайго» народа выглядае «ліберальнай» нават нямецка-фашысцкая акупацыя. Верагодна, апошнія ў гісторыі імперскія захопнікі з Германіі нічога новага не прыдумалі ў сваёй вайне. Так было заўсёды — ад тактыкі *выпаленай зямлі* біблейскага Ісуса Навіна і рымскага генацыду падчас Іудзейскай вайны 66–73 гг. да сучасных «лакальных» войнаў. Уладзімір Манамах у «Павучанні» сваім сынам хваліцца тым, што ў паходах 1083 года знішчыў Мінск, не пакінуў там «ні раба, ні скаціны». Генацыд супраць уласнага народа — гэта нешта новае ў гісторыі імперыяў, «адкрытае» Іванам IV Жахлівым і Сталіным Крывавым.

У імперыі Сталіна на Беларусь абрынуўся не толькі смяротны ўдар у «цела нацыі» (разбурэнне этнічнага ядра нацыі шляхам прымусовай галапіруючай індустрыялізацыі і гвалтоўнай калектывізацыі), але і ў галаву «народа» (знішчэнне і падаўленне нацыянальна свядомай і палітычна актыўнай эліты). Выглядае амаль боскім цудам, калі невялікая нацыя (каля 10 мільёнаў) выжыла і, як тая казачная птушка Фенікс, адраджалася з уласнага попелу.

Якая ж перспектыва ў беларускай нацыі на будучыню? Куда ёй ісці — на Усход, на Захад? А можа — трэцім, *сваім* шляхам? Нядаўна я прачытаў псеўданавуковы опус нейкага самадзейнага філосафа пад загалоўкам, здаецца, «Нацыя-гермафрадыт». Гутарка ідзе пра беларусаў. Аўтар хацеў прынізіць беларускую нацыю, якую ён не разумее і на якую крыўдзіцца з інфантыльнай наіўнасцю. Ад такой пісаніны дрэнна пахне, не варта сур'ёзна рэагаваць на яе. Толькі глянуць — і пайсці далей. Але ў канцэпцыі аўтара, што Беларусь балансуе паміж усходнім «жаночым» і заходнім «мужчынскім» тыпамі і ёсць нейкая зрэбная праўда. Мабыць, гістарычная місія Беларусі — у пераадоленні аднабаковасці «ўсходняга» і «заходняга» полюсаў. Бо ўсялякая аднабаковая сістэма няўстойлівая і ў далёкай перспектыве не мае будучыні. Падобна таму, як не прынясуць плёну ізаляваныя і варожыя паміж сабою «мужчынскі» і «жаночы» пачаткі быцця.

Стабільнасць, устойлівасць і, як вынік, — перспектыўнасць нацыі залежаць ад трох фундаментальных рэальнасцей: наяўнасці моцнага, лакалізаванага на сваёй спрадвечнай прасторы, самабытнага і кансерватыўнага этнічнага *ядра* нацыі, якое выпраменьвае этнакультурнае *поле прыцягнення;* сфарміраванай у гэтым культурным полі нацыянальна свядомай, асвечанай, кампетэнтнай, духоўна актыўнай эліты, якая фарміруецца

не толькі з інтэлектуалаў, але і творчай часткі ўсяго грамадства; урэшце, ад створанай гэтай элітай культурнай традыцыі, якая прываблівае і праграміруе нацыянальны выбар не толькі свайго народа, але таксама лепшых людзей нацыянальных меншасцей.

Сёння гэтыя *тры калоны,* што забяспечваюць устойлівасць нацыі і яе духоўны рост у вышыню, моцна дэфармаваныя ў беларусаў. За гэтае калецтва беларускай нацыі нясуць адказнасць перад Богам і гісторыяй не толькі былая Расійская імперыя і яе бальшавіцкі варыянт — СССР, але таксама сучасны Еўрапейскі Саюз, нашчадак былой Антанты і, між іншым, Польшча як спадкаемца міжваеннай Рэчы Паспалітай. Пастверсальская Еўропа ў крытычны момант адраджэння Беларускай дзяржавы 1917–1921 гг. не толькі не падтрымала яе, але і дазволіла парэзаць жывое цела нацыі з тысячагадовай культурнай і дзяржаватворчай традыцыямі паміж бальшавіцкай Расіяй і адроджанай Польшчай, дзе ўзялі верх прэтэнзіі на адраджэнне міфічнай польскай імперыі з анексіяй значных частак Беларусі, Украіны і Літвы.

У новым тысячагоддзі беларусам яшчэ спатрэбяцца духоўны гераізм і рыцарская ахвярнасць, каб забяспечыць сваёй радзіме права суверэннай нацыі. Але будучыня — за ёю. Бо сёння дажывае свае старэчыя гады апошняя, амаль напаўміфічная, калісьці рэанімiраваная бальшавікамі тэрытарыяльная, напаўфедэральная імперыя, што сёння ўсё яшчэ спрабуе задушыць Беларусь у «сяброўскіх абдымках». Яна здолела амаль на цэлае стагоддзе аднавіцца і пратрымацца пасля распаду ў войнах і рэвалюцыях 1914–1920-х гг. Але толькі коштам страты людскіх свабод і крывавай дыктатуры. Імперыя і дэмакратыя — рэчы несумяшчальныя. Нават ад лёгкіх павеваў вятроў дэмакратыі разваліўся Савецкі Саюз.

Гісторыя даўно засведчыла: усе ранейшыя імперыі маглі часова ўтрымацца *толькі на крыві.* Амаль няспынныя катаклізмы ў сучаснай Расіі сёння не толькі рэальныя факты, але і сімвалы. На мяжы тысячагоддзяў для сучаснай Расіі паўстала нялёгкая задача — адрадзіць нацыянальную дзяржаву, даўшы «вольную» ўсім сваім калоніям. Збіраць трэба не тэрыторыі, а вялікарускі народ. У XXI ст. застануцца толькі фінансавыя імперыі. Але, як на мой погляд, не надоўга. Першыя сімптомы — пачатак агульнага крызісу магутнай доларавай імперыі. Маю на ўвазе драматычныя падзеі Трэцяй балканскай вайны — агрэсіі НАТА на чале з ЗША супраць Сербіі, што ўсё трымаецца

сёння ў складзе міфічнай Югаславіі. Затрачаных сродкаў на вайну і кошт матэрыяльных страт у гэтай вайне было б дастаткова, каб заснаваць у нейкай пустыні багатую дзяржаву для косаўскіх албанцаў-мусульман (як на мой погляд, гэта рудыменты былой Турэцкай імперыі). Няхай бы там яны стварылі квітнеючую сельскую гаспадарку. Замест таго, каб гандляваць наркотыкамі.

Будучыня — толькі за духоўнай імперыяй, дзе, у рэшце рэшт, перакуюць дзіды і мячы на сярпы і плугі ды не будуць больш вучыцца ваяваць. Тады наступіць канчатковае нацыянальнае адраджэнне Беларусі, іншых народаў, сёння адсунутых за авансцэну сусветнай гісторыі.

---

[1] Замм Астрид. Белорусы: опыт самоидентификации // Нёман. 1994. № 5. С. 136.

Ryszard Radzik (Lublin, Polska)

## Formowanie się nowoczesnej polskości i bialoruskości w dwóch ostatnich stuleciach: podobieństwa i różnice

Porównując ze sobą polskość i białoruskość czynił to będę głównie w ich wyrmarze narodowym. Dotyczy to w mniejszym stopniu białoruskości, jako że Białorusini zostali unarodowieni jedynie w niewielkim stopniu. Odwołam się tu zatem również do innego — nie narodowego — systemu wartości spajającego naszych wschodnich sąsiadów. Przyczyny traktowania obu społeczeństw i ich kultur w kategoriach narodowych nie są błahe. Jak zauważa Jerzy Szacki, «narodziny narodu są […] w istocie tożsame z narodzinami nowoczesnego społeczeństwa i z tego powodu stanowią wydarzenie w najwyższym stopniu rewolucyjne. W tym sensie nowoczesny naród francuski narodził się dopiero po 1789 roku, polski zaś rodził się w bólach przez cały XIX wiek i stał się faktem dopiero wraz z «unarodowieniem mas ludowych» jak to określał Józef Chałasiński»[1]. Liah Greenfeld uważa, iż naród jest «konstytutywnym

elementem modernizacji», zatem modernizacja jako przejście od społeczeństw tradycyjnych do przemysłowych dokonuje się poprzez nacjonalizm (w anglosaskim, szerokim, nie wartościującym rozumieniu tego pojęcia) jako nośnik nowoczesności[2]. Naród można też traktować jako wytwór procesów modernizacji i zarazem jako składnik tego procesu w dwóch ostatnich stuleciach historii Europy. Naród był rezultatem rozpadu społeczeństw agrarnych, ale i sam przyśpieszał ten rozpad: niszczył dawne struktury i konstruował nowe. Jako nowa, dynamiczna wspólnota mobilizował swych członków do modernizacyjnego wysiłku w oparciu o określającą go strukturę wartości, w tym także ciągłą potrzebę odnoszenia się do innych (w tej skali wcześniej raczej nie spotykaną). Zatem naród — w przeciwieństwie do tradycyjnej, przedindustrialnej grupy etnicznej — formował się w procesie ideologicznej konfrontacji z innymi wspólnotami. Jego siła modernizacyjna wynikała między innymi z chęci dorównania innym bądź prześcignięcia ich, co aktywizowało społeczenstwo i skłaniało je do poświęceń. Procesy formowania się nowoczesnych narodów w Europie wiązały się również z pojawieniem się nacjonalizmów w środkowoeuropejskim — odmiennym od anglosaskiego — rozumieniu tego pojęcia, widocznych zwłaszcza w pierwszej połowie naszego stulecia, choć nie zanikłych do dzisiaj.

Relacje między XIX-wieczną polskością i białoruskością były zasadniczo inne niż obecnie. Inne były też treści obu pojęć. W dwóch wielkich organizmach społeczno-politycznych Europy Środkowo-Wschodniej — Rzeczypospolitej oraz Węgrzech — kształtowały się do momentu ich upadku, wzorem zachodnim, po części pod wpływem ideologii oświeceniowej, narody polityczno-państwowe łączące elity tamtejszych społeczeństw (głównie szlachtę) we wspólnotę o charakterze ponadetnicznym. Pozostałości takiego myślenia o narodzie widoczne były wśród szlacheckich (katolickich) elit na Białorusi przez całe XIX stulecie, ulegały ewolucji po powstaniu styczniowym, gwałtownie słabły w pierwszej połowie XX wieku. Dawna Rzeczpospolita, w przeciwieństwie do Rosji, odbierana była jako własny organizm państwowy. Związane z tym tradycje oceniane były pozytywnie. Z czasem dawne państwo ulegało w świadomości elit mitologizacji — odnoszenie się do niego zabarwione zostało trwałym ładunkiem emocji.

Znawca dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego, Władysław Wielhorski, przedstawiając rozwój stosunków między Litwinami, Białorusinami i Polakami na tym obszarze, zwłaszcza zaś narodową (świadomościową) ewolucję tych zbiorowości w okresie

zaborów, pisał, że «do oceny omawianej przeszłości nie można przystępować z probierzami współczesnych pojęć i dążen narodowych, czy społecznych. Historia bowiem naginana do kryteriów doby bieżącej, staje się niezrozumiała» [3]. Tak samo brzmiącej terminologii narodowej przypisuje się obecnie inny niż niegdyś zakres treściowy. Dotyczy to między innymi takiego pojęcia jak «Litwin», w którym — na ziemiach litewsko-białoruskich — nie kryło się co najmniej do powstania styczniowego nic niepolskiego. Pojęcie polskości zawierało w owym czasie inną treść niż obecnie. Również odmienne były relacje między narodowo-polityczną polskością, regionalno-polityczną litewskością i kulturową, etnicznorodową, zawierającą się w dwóch poprzednich — białoruskością. Zgodnie z myśleniem w kategorii *gente Lithuam, natione Poloni* («rodu litewskiego, narodowości polskiej»), pojęcie Litwina było węższe od pojęcia Polaka [4]. Jak zauważa Juliusz Bardach, «w wyniku asymilacji językowo-kulturalnej termin «Polak», w XVI w. wyraźnie przeciwstawny «Litwinowi», w XVIII stuleciu stawał się synonimem obywatela całej Rzeczypospolitej» [5]. Zarazem «fakt przywiązania do przeszłości Wielkiego Księstwa wyróżniał w sposób istotny Polaków litewskich od Koroniarzy» [6].

Ten sposób samookreślania się charakteryzował szlachtę, stan powołujący w ostatnich dziesięcioleciach XVIII wieku w swych bardziej światłych, aktywnych środowiskach — wraz z przedstawicielami nielicznego wówczas mieszczaństwa — ideę oświeceniowej, politycznej wspólnoty narodowej wykraczającej poza stanowe bariery «narodu szlacheckiego» i obejmującej całość ziem Rzeczypospolitej bez względu na istniejące podziały etniczne. Za Litwinów uważali się ci, którzy wywodzili się ze społeczeństwa Wielkiego Księstwa Litewskiego, bez względu na podziały etniczno-kulturowe. Litewską była zatem szlachta wywodząca się zarówno z rodów etnicznie litewskich, jak i białoruskich, która z kolei wszystkich swych chłopów, bez względu na język i wyznanie, uważała za Litwinów [7]. Litewskość oznaczała rodowe pochodzenie, związek z krajem, jego społeczeństwem, historią, przyrodą, wspólnotami lokalnymi. «Woyniłłowicze — twierdzi przedstawiciel rodu — nie przybyli ani ze Wschodu, ani z Zachodu, są rdzenni, miejscowi, krew ze krwi, kość z kości tego ludu, który niegdyś grzebał się w tych kurhanach, dzisiaj na cmentarzach wiejskich i rodzinną ziemię białoruską sochą kraje» [8].

Białoruszczyzna była w ubiegłym stuleciu jednym z kulturowych składników politycznie pojmowanej polskości, regionalnie ją wzbogacającym i — analogioznie do relacji między prowansalskością a

francuskością — niesprzecznym z nią. Tak też w okresie Romantyzmu traktowano białoruską etnografię, folklor. Dla Jana Czeczota zbierającego i zapisującego wytwory ustnej twórczości ludu białoruskiego, pieśń miała jednoczyć wieś z dworem, być elementem ogólnonarodowej kultury, pośredniczyć w przekazywaniu wartości, idei, zarówno od chłopa do pana, jak i odwrotnie; uwagę dworu zwracać «ustawicznie powinna na stan będący podstawą szczęścia powszechnego» [9]. W 1846 roku, a więc wówczas, kiedy na innych obszarach Europy Środkowo-Wschodniej stawał się już widoczny proces formowania się narodów plebejskich w oparciu o kryteria etniczno-językowe, Czeczot pisał o języku białoruskim zwanym przez niego «dialektem krewickim», iż «wątpić należy, aby sam został piśmiennym i kształcił się samodzielnie» [10]. Jednocześnie wypowiadał się o białoruszczyźnie jako mowie, «którą w pamięci naszej żyjący jeszcze, staruszkowie panowie między sobą lubić mówili, którą dotąd mówią panowie i ekonomowie z włościanami» [11].

Po białorusku mówiła na co dzien znaczna część drobnej szlachty bez względu na przynależność religijną. Był to język, którym posługiwała się spora część mieszkańców miast i miasteczek (nie mówiąc już o chłopach). Białoruski był językiem, w jakim często zwracali się do chłopów ziemianie. Jeden z nich, Aleksander Jelski, pisał w 1883 roku w petersburskim «Kraju»: «Białoruskie narzecze miłe było zawsze ruchu i sercu wszystkich warstw tutejszego społeczeństwa» W tymże tekście eksponował praktyczny wymiar białoruszczyzny: «szanując patriarchalna mowę ludu naszego, zawsze jej a nie innej używamy w stosunku z ludem» [12]. Język ten odbierany był przez szlachtę jako mowa swojska, lecz — zwłaszcza zdaniem ziemian — chłopska. Za obcy uważano język rosyjski, nigdy zaś białoruski, który długo uznawano za dialekt polszczyzny, jej część składową i wschodnie przedłużenie. Białoruszczyznę ziemianie traktowali jako język miejscowy (krajowy), mający prawo do trwania, nie dążąc do jego likwidacji na rzecz polszczyzny (tego rodzaju próby, podejmowane pod koniec zaborów, w wieku XX, inicjowały na ogół inne środowiska społeczne, głoszące etniczno-kulturową ideę narodu). Niekiedy zdawali sobie sprawę z tego, że był to język ich przzodków, podobnie jak z tego, iż był niegdyś językiem urzędowym kraju, w którym mieszkali, językiem ksiąg i szkół. Nie była to jednak świadomość powszechna.

Sumując, stwierdzić można, iż pojęcie «rodu litewskiego, narodowości polskiej» zakładało harmonijny związek terminologicznie litewskiej przynależności rodowej (zawierającej jednak w sobie

białoruskość) z przynależnością do polskości jako nadrzędnej wspólnoty narodowej. Litwin nie mógł być przeciwstawiony Polakowi, lecz Koroniarzowi, Rusinowi bądź Mazurowi i Wielkopolaninowi. Wszyscy oni byli Polakami niezależnie od języka, wyznania i miejsca zamieszkania. «Litwin i Mazur — pisał Mickiewicz — bracia są; czyż kłócą się bracia o to, iż jednemu na imię Władysław, drugiemu Witowt? Nazwisko ich jedne jest: nazwisko Polaków». Konstanty Rinaldo Borowski wspominając pobyt w więzieniu pisał o czasach powstania styczniowego: «Między nami Polakami byli przeważnie Litwini, Żmudzini, Podolacy, Wołyniaki i Rusini». Określenie «Polak» znaczyło, że jest się obywatelem Rzeczypospolitej, spadkobiercą tej części dorobku państwa polskiego, która wspólna była jej wszystkim mieszkańcom niezależnie od podziałów etnicznych i regionalnych. Po upadku państwa ten typ myślenia utrzymywał się dość długo. Co oczywiste, nie był elementem świadomości chłopów, uważających siebie za Litwinów, Ruskich, Mazurów, tutejszych…, lecz nie Polaków, które to określenie miało wyraźny kontekst stanowy, «pański» (aczkolwiek z czasem coraz silniej przypisywali je sobie również — co prawda, w nieco innym znaczeniu — chłopi, łącząc je jednoznacznie na poziomie świadomości etnicznej, a nie narodowej, z katolicyzmem, a więc na ogół nie przyjmując jeszcze treści uwewnętrznionych przez szlachecko-inteligenckie elity).

Można zatem powiedzieć, że w wieku XIX na Białorusi wciąż dominowały na poziomie oświeconych elit kraju, katolickiej szlachty, wywodzącej się z niej — aczkolwiek nie w pełni jeszcze wyodrębnionej — inteligencji (jej przedstawiciele wciąż uważali się przede wszystkim za szlachtę), bardzo słabych jeszcze środowisk mieszczańskich, kategorie narodu politycznego, ponadetnicznego (a więc łączące etnicznych Polaków z Białorusinami), zgodnie z którymi język polski był bardziej środkiem komunikacyjnego przekazu, porozumiewania się, świadectwem stanowo-kulturowej wyższości niż wartością samą w sobie w sensie narodowym, a więc konstytującą naród w oparciu o kryterium etnicznego pochodzenia i oddzielającą nosicieli innych języków od tak rozumianej wspólnoty. Było tak, mimo niewątpliwego przywiązania elit do polszczyzny, której znajomość pociągała za sobą cały kompleks cech kulturowych. W tak rozumianej polskości możliwa była również więź z miejscowym, prawosławnym chłopstwem. Objawiało się to nierzadko finansowaniem budowy unickich, a następnie prawosławnych świątyń, udziałem w cerkiewnych uroczystościach. Polityczna polskość wyrastała z tradycji Rzeczypospolitej, w której

szlachta była stanem panującym, uważającym — nie bez powodu — że państwo należy do niej, ceniącą sobie daleko bardziej swoje prawa wolnościowe niż etniczno-kulturową przynależność. Możliwe to było w społeczenstwie silnie zhierarchizowanym, o z urodzenia przypisanych rolach społecznych, w którym dystanse między poszczególnymi segmentami struktury społecznej były odbierane jako pierwszorzędne, tłumiąc przecinające te segmenty podobienstwa kulturowe, etniczno-językowe.

Dopóki trwał taki stan rzeczy, elity Białorusi odbierały się poprzez odmesienie do trzech ojczyzn: narodowej, ogólnopolskiej (politycznej), w ramach której jej mieszkanców łączyły więzi ideologiczne; regionalnej, odnoszonej do obszaru byłego Wlk. Ks. Litewskiego, spajanej zarówno więziami nawykowymi, jak i ideologicznymi; małej (nazywanej przez Stanisława. Ossowskiego prywatną), ograniczonej sferą bezpośrednich doświadczen osobniczych [13] . Zarówno ojczyzna prywatna, jak i regionalna były ojczyznami — terminologicznie — litewskimi, w przeciwienstwie do ojczyzny ideologicznej — polskiej. Ta wielość ojczyzn odzwierciedlała hierarchiczny, wieloszczeblowy system charakteryzujący wspólnotowy układ) społeczeństw feudalnych. Mickiewicz mówiąc «Litwo! Ojczyzno moja!...» łączył ojczyzny: prywatną i regionalną w jednym stwierdzeniu. Na Litwę spoglądał poprzez pryzmat rodzinnej Nowogródczyzny, miejsc młodości i nauki: Wilna i Kowna. Litwa nie była jednak dla niego tylko wyrazem sentymentalnych uczuć do rodzinnych krajobrazów i bliskich mu ludzi. Miała również wymiar idei trwającej w spółecznej świadomości. Świadomość ta wyrażała przede wszystkim solidamość polityczną, wierność W. X. Litewskiemu, jako państwu, wolę służenia mu czynem. Ponadto wyrażała (...) poczucie jedności pochodzenia i braterstwa krwi z ludem litewskim i białoruskim większości warstw dziejotwórczych Litwy» [14] .

Miejscowe chłopstwo, na ogół w swej zdecydowanej większości niezdolne przez cały ubiegły wiek do myślowego wykraczania poza własną wioskę, parafię, okolicę, przyjmowania więzi ideologicznych łączących ją z nieznanymi jej ludźmi, zawierało się jedynie w ramach ojczyzny prywatnej. Tak było zarówno w przypadku chłopów białoruskich, jak i polskich osadników zwanych Mazurami. Zatem chłopska białoruskość miała w XIX stuleciu wyłącznie wymiar etniczny, nawykowy (etnograficzno-folklorystyczny), o niskim stopniu autorefleksji — tak różny zatem od zideologizowanego, narodowego. Nie znaczy to jednak, by układ ten nie podlegał w ubiegłym wieku powolnej, stopniowej ewolucji, widocznej w pełni dopiero w następnym stuleciu.

Obejmowała ona zarówno elity, jak i wieś. Z jednej strony, polski naród polityczny ewoluował w kierunku kulturowego (etniczno-językowego), co widoczne było znacznie wcześniej w Kongresówce niż na ziemiach białoruskich, z drugiej natomiast, na poziomie elit poczęła się tworzyć nowoczesna białoruskość. W XIX wieku miała ona prawie wyłącznie charakter kulturowy, a nie narodowy.

Tekst ten nie jest poświęcony analizie przyczyn rozpadu w Europie Środkowo-Wschodmej narodów politycznych i powstaniu w ich miejsce narodów kulturowych. Proces ten został przedstawiony w innym artykule[15]. Mówiąc krótko, na omawianym tu obszarze wpłynął na to w stopniu znaczącym upadek państwa polskiego oraz stopniowy spadek społecznego znaczenia szlachty jako warstwy zainteresowanej trwaniem tradycyjnego, zhierarchizowanego układu wspólnot, łączącego gospodarczo pana z chłopem, przeciwstawiającego ich sobie klasowo, lecz nie narodowo. Nośnikiem nowych kategorii narodowych była inteligencja. Wyróżnikami konstytuującymi inteligencję jako warstwę społeczną nie nie były wartości polityczne, gospodarcze bądź prawo (jak było to w przypadku szlachty) — lecz kultura. Było to środowisko ludzi łączących się w szczególnych warunkach społecznych, bliskich sobie z uwagi na swoje położenie, skupiających się i trwających dzięki woli trwania i produktom tej woli — kulturze. Jej członkowie łączyli się towarzysko, uznawali bliskie sobie wartości i przestrzegali wspólnych wzorów zachowań. Z ludem wiązały ich więzi pośrednie, ideologiczne. W przeciwieństwie do ziemian zainteresowanych trwaniem wspólnot terytorialno-gospodarczych — niezależnie od istniejących wewnątrz nich dystansów, podziałów stanowo-klasowych i etnicznych — inteligencja wywoływała i akceptowała podziały społeczne według granic kulturowych. Związany na co dzień ze społecznością chłopską ziemianin odczuwał natychmiast i bezpośrednio negatywne skutki zaistniałego we wspólnocie lokalnej konfliktu narodowego. Natomiast inteligencję tworzyli ludzie jednostkowo anonimowi wobec miejskiego tłumu. Miejski inteligent głoszący idee narodu kulturowego nie musiał spotykać się ze swymi ideowymi, narodowymi przeciwmkami. Wywołane przez niego w społeczności lokalnej podziały nie groziły jego interesom ekonomicznym, a również nie zagrażały jego pozycji społecznej. Wprost przeciwnie. Inteligent jako ich twórca stawał się «przewodnikiem społecznym» tych, którzy jego ideom ulegli[16].

Na ziemiach litewsko-białoruskich inteligencja była — w porównaniu z jej odpowiednikiem w Kongresówce — warstwą bardziej nieokreśloną, płynną zarówno jeśli chodzi o jej zewnętrzne formy,

jak i charakteryzujące ją treści. Jej powolne formowanie się było przyczyną stosunkowo długiego trwania na tym obszarze tradycyjnej wizji narodu. Po rewolucji lutowej wzrosło poparcie, jakiego inteligencja udzielała — wraz z młodszym pokoleniem szlachty, sporą częścią mieszczaństwa (zwłaszcza drobnomieszczaństwa) — coraz bardziej znaczącym politycznie narodowym demokratom [17].

Im szybciej odchodził w przeszłość na wpół sfeudalizowany świat szlacheckich dworków, tym bardziej rozprzestrzeniała się idea narodu kulturowego. Niosła z sobą niekiedy wartości nacjonalistyczne, lecz również stwarzała szanse na narodowe zaistnienie Litwinom, Ukraincom i Białorusinom. Dla Polaków była reakcją obronną na rosyjską zaborczość. Białorusinów broniła przed roztopieniem się w polskości lub rosyjskości.

całej niejednoznaczności tego procesu — przeczą tak rozumianej białoruskości, wyraźnie nawiązując do tradycji europejskiej, tamtejszych wartości i mechanizmów rozwoju społecznego. Zwolennikom sowieckiej białoruskości idea narodowa reprezentowana przez BNF, a więc powielająca typowe wzory europejskie, kojarzy się z faszyzmem, nacjonalizmem i zdradą narodową (a raczej «ludową»). Do pewnego stopnia współgrają z tymi poglądami tendencje wciąż obecne w Rosji, zgodnie z którymi Białoruś — to czast' Rossii, a Białorusini — to russkije [28]. «Slogany «Chcemy do Europy» — piszą Juraś Lichtarowicz i Uładzisłau Iwanou — przypominają czerwone tarcze z napisem: «Nigdy nie rozdzielą nas z bratnią Rusią» [29]. W mniejszym lub większym stopniu obecne w opcji narodowej, zwłaszcza BFN-owskiej, takie wartości, jak: indywidualizm, trójpodział władzy (w tym silny parlament), ciągłe ścieranie się na arenie politycznej różnych partii i poglądów wewnątrz partii (a więc silna rola partii w społeczeństwie), wolność jednostki, partnerskie stosunki między władzą a jednostką, własność prywatna, rządy demokratyczne (rządy prawa), gospodarka rynkowa — obce są znacznej części społeczeństwa białoruskiego, przede wszystkim zaś zwolennikom białoruskości sowieckiej.

Jak na razie, procesy narodowe mają niewielką szansę na gwałtowny rozwój. Więzi narodowe formowały się niegdyś w sytuacji braku wśród mas społecznych jakichkolwiek innych więzi ideologicznych (religijne uległy przeformułowamu i razem z klasowymi zostały z czasem na poziomie społeczeństwa podporządkowane więziom narodowym). Warstwy plebejskie XIX i XX-wiecznej Europy przechodziły od więzi nawykowych charakteryzujących małe wspólnoty lokalne — rozpadające się jednak w industrializujących się społeczeństwach — z konieczności do więzi szerszych, ideologicznych, prawie zawsze narodowych. Sytuacja na obecnej Białorusi jest inna. Więzi narodowe nie wchodzą w społeczną pustkę. Muszą wyprzeć inne więzi ideologiczne oparte na wartościach sowieckich. Nie jest to zatem powielenie dawnego procesu. Co więcej, tego typu wymiana więzi jest bardzo trudna, podobnie jak masowe zastąpienie jednej — w pełni już wykształconej — świadomości narodowej inną, co oznacza zmianę przynależności narodowej. Są to procesy występujące raczej na poziomie jednostek i stosunkowo niedużych grup społecznych, a nie całych wielomilionowych narodów.

Białoruscy narodowcy eksponowali na początku lat 90-tych ideę narodową w jej typowym wymiarze kulturowym, językowo-etnicznym. Opozycyjny działacz polityczny Wiktor Iwaszkiewicz stwierdza,

że w II połowie lat 80-tych ruch narodowy miał charakter antykomimistyczny, ale nie był ruchem demokratycznym. Interesowała go narodowa symbolika, a nie postulaty związane z prawami człowieka i podziałem władzy, które odbierano jako promoskiewskie[30]. Z czasem białoruski ruch narodowy począł coraz silniej eksponować potrzebę demokratyzacji państwa, przeprowadzenia reform politycznych i gospodarczych, budowy społeczeństwa obywatelskiego. Stało się to bardzo widoczne zwłaszcza w ostatnich latach tego dziesięciolecia. Na tę ewolucję wpłynęła również niechęć znacznej części społeczeństwa do przyjmowania idei narodowej. Okazało się, że trudno ją upowszechniać w społeczeństwie niedemokratycznym, w którym autorytarna władza odwołuje się do nastawionych anarodowo bądź wręcz antynarodowo mas; nie stwarza zatem szansy na szersze zaistnienie (propagowanie własnego programu) opcjom mniejszościowym. Zapewne białoruscy narodowcy liczą również na to, że wraz z pogłębianiem się kryzysu w państwie, coraz większa część społeczeństwa opowiadała się będzie za jego przebudową polityczną, w tym również za demokratyzacją.

Nie wydaje się realne na Białorusi — mimo iż niekiedy się tak twierdzi — zbudowanie w dającej się przewidzieć przyszłości narodu typu politycznego, zbliżonego do zachodnioeuropejskiego. Białorusini nie dysponują ani tradycją własnej państwowości, nieprzerwanej przez stulecia (jak jest to w Wielkiej Brytanii lub Hiszpami), ani też atrakcyjną ideologią, jaką upowszechniali rewolucjoniści francuscy pod koniec XVIII wieku. Ukształtowano ich nie jako naród typu politycznego, lecz jako społeczeństwo polityczne typu sowieckiego i zastąpienie politycznej sowieckości politycznym wymiarem narodu nie wydaje się przedsięwzięciem łatwym do zrealizowania.

W związku z prowadzoną na Białorusi dyskusją nad możliwością zbudowania społeczeństwa obywatelskiego należy zwrócić uwagę na to, że społeczeństwa takie kształtują się zawsze na podłożu narodowym. Narodowe wartości głęboko uwewnętrznione i zapewniające trwanie wspólnoty (stabilizujące społeczeństwo), umożliwiają rozwój społeczeństwa obywatelskiego, które jak się wydaje, przynajmniej na razie nie dysponuje wartościami tak silnie i trwale budującymi wspólnotowość odporną na kryzysy, jednoczącymi nie tylko w dobrobycie, ale i w biedzie, jakie posiada naród. Białorusini tego spajającego podłoża narodowego nie mają.

Między treściami budującymi dzisiaj polskość i białoruskość jest więcej różnic niż podobieństw. Podobieństwa dotyczą ich narodowego wymiaru: bardzo silnie nasycającego polskość i bardzo

słabo białoruskość. W polskości wyraźnie obecne są treści elitarystyczno-aktywistyczne (mimo jej plebeizacji w okresie PRL-u), w białoruskości silnie eksponowane są wartości plebejskie, nieobecne bądź też niezwykle słabe są w niej skłonności insurekcyjne (Polacy przyznali się do elit niegdysiejszej Białorusi, a elity te opowiedziały się za polskością; Białorusini mówiąc w uproszczeniu odrzucili je). Przyniesiona do Polski ze wschodu wraz z ustrojem sowieckość jest w Polsce bez porównania słabsza niż na Białorusi (i towarzyszy rozwiniętemu poczuciu narodowemu). Porównywalna z białoruską jest jedynie wśród byłych pracowników Państwowych Gospodarstw Rolnych (odpowiedników sowieckich sowchozów).

Białoruski ruch narodowy powstał zbyt późno (do czego w dużym stopniu przyczyniły się władze carskie), by w XX wieku ukształtować społeczeństwo białoruskie na wzór środkowo- lub zachodnioeuropejski. Władze moskiewskie w ZSRS nie dopuściły do powielenia zachodnich wzorów formowania się nowoczesnego społeczeństwa i narodu Białorusinów, niegdyś budujących wspólne państwo z Polakami, należących z nimi do jednego kręgu kulturowego, dyskryminowanych w dobie formowania się narodów językowo-etnicznych przez Polaków w II Rzeczypospolitej, dzisiaj różni z nimi daleko więcej niż niegdyś. Spośród dwóch społeczeństw, jedno zapatrzone jest głównie na wschód, na Rosję i do wspólnoty z nią się poczuwa, drugie, na zachód, Berlin, Londyn lub Waszyngton i tylko wraz z nimi widzi swoje miejsce w Europie i na świecie. Ich drogi — niezależnie od tego, jakie są nasze pragnienia — niewątpliwie w ostatnich 10 latach bardziej rozchodzą się niż schodzą.

---

[1] J. Szacki, O narodzie i nacjonalizmie, "Znak" 1997. Nr 3. S. 14.

[2] L. Greenfeld, Nationalism. Five Roads to Modernity, Harvard Univ. Press., Cambridge, Mass. – London 1992. S. 18.

[3] W. Wielhorski, Litwini, Białorusini i Polacy w dziejach kultury Wielkiego Księstwa Litewskiego, "Alma Mater Vilnensis". Londyn 1951. T. II. S. 153.

[4] O "wieloszczeblowej świadomości naródowej» mieszkańców ziem litewsko-białoruskich pisze J. Bardach w wielu swoich pracach, m.in.: J. Bardach, Polacy litewscy a inne narody Litwy historycznej. Próba analizy systemowej, [w:] Belarus, Lithuania, Poland, Ukraine. The Foundations of Historical and Cultural Traditions in East Central Europe. Ed.: J. Kłoczowski, H. Gapski, Lublin 1994. S. 363–370.

[5] J. Bardach, Polacy a narody Litwy historycznej — próba analizy systemowej, "Kultura i Społeczenstwo" 1994. Nr 2. S. 38.

[6] Tamże. S. 39.

[7] P. Bobrowskij, Możno-li odno wieroispowiedanije priniat' w osnowanije plemiennogo razgraniczenija sławian zapadnoj Rossii. (Po powodu

etnograficzeskago atłasa zapadno-russkich gubiernij i sosiednich obłastiej R. F. Erkerta), S.-Pietierburg [1864], przedstawia etnograficzne spisy prowadzone przed powstaniem styczniowym — na zlecenie — przez duchowieństwo guberni grodzieńskiej, z których wynika, że “parafianie, tak prawosławni, jak i katolicy, nazywani są Litwinani” (S. 14). “Nie tylko ci białoruscy chłopi nie nazywają siebie Białorusinami — zaznacza badacz rosyjski — nie tylko wielu duchownych, ale nawet i księża, nie mówiąc o ziemianach, Białorusinów uważają za Litwinów” (S. 25). Ani jeden ksiądz, zauważa Bobrowski, nie nazwał swych mówiących po białorusku parafian Polakami, lecz określił ich mianem Litwinów. Zrobiono tak, ponieważ Białorusini wchodzili niegdyś w skład państwa litewskiego (S. 25).

[8] E. Woyniłłowicz, Wspomnienia 1847–1928. Wydał, wstępem i przypisami opatrzył J. Iwaszkiewicz, cz. 1, Wilno 1931. S. VIII.

[9] [J. Czeczot], Piosnki wieśniacze z nad Niemna, Dniepra i Dniestra, Wilno 1845. S. XII.

[10] [J. Czeczot], Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiomy, w mowie Sławiano-Krewickiej, spostrzeżeniami nad nią uczynionemi, Wilno 1846. S. VII.

[11] Tamże. S. V.

[12] Korespondencja A. Jelskiego z 12 XI 1883, “Kraj” 11/23 XII 1883. Nr 50, cyt. za: J. Jurkiewicz, Rozwój..., S. 98 (przyp. 512).

[13] Ossowski posługuje się dwoma pojęciami ojczyzny: prywatną i ideologiczną, wiążące odpowiednio z dwoma typami więzi: nawykową i ideologiczną; S. Ossowski, Dzieła. T. 3, Warszawa 1967. S. 210–211.

[14] W. Wielhorski, Narodowość Mickiewicza w świetle współczesnej socjologii i etnografii, “Alma Mater Vilnensis”, t. V, Londyn 1958. S. 104–105.

[15] Zob. R. Radzik, Formowanie się narodów w Europie Środkowo-Wschodniej, “Kultura i Społeczeństwo” 1993. Nr 4.

[16] Połączenie inteligenckiej ideologii prymatu kulturowego z chłopską ksenofobią i konserwatyzmem, w sytuacji napływu mas ludowych do miast i braku mechanizmów rozładowujących napięcia społeczne (gospodarcze, polityczne...), rodziło nacjonalizm.

[17] Zob. L. Wasilewski, Kresy wschodme. Litwa i Białoruś — Podlasie i Chełmszczyzna — Galicja Wschodnia — Ukraina, Warszawa–Kraków 1917. S. 108.

[18] Szerzej piszę o tym w: Literackie źródła nowoczesnej białoruskości, “Przegląd Powszechny” 1994. Nr 3.

[19] Szerzej piszę o tym w: Idea narodu białoruskiego w drukach narodników grupy petersburskiego pisma “Гомон”, “Slavia Orientalis” 1995. Nr 3.

[20] Cyt. za: I. W. Czakwin, P. W. Tierieszkowicz, Iz istorii stanowlenija nacyonalnogo samosoznanija biełorusow (XIV – naczało XX w.), “Sowietskaja etnografija” 1990. Nr 6. S. 47.

[21] H. I. Kaspiarowicz, Biełarusy. Farmirawannie biełaruskaj nacyi, [w:] Etnahrafija Biełarusi. Encykłapiedyja, Minsk 1989. S. 67, 70; zob. A. Ćwikiewicz, “Zapadno-russizn”. Narysy z historyi hramadzkaj myśli na Biełarusi u XIX i paczatku XX w., Miensk 1929; M. O. Kojałowicz, Istorija russkogo samosoznanija. Po istoriczeskim pamiatnikam i naucznym soczinienijam, Minsk 1997 (wyd. 4).

[22] L. Wasilewski, Litwa i Białoruś. Zarys historyczno-polityczny stosunków narodowościowych, Warszawa-Kraków 1925. S. 134–135; P. Wróbel, Kształtowanie się białoruskiej świadomości narodowej a Polska, Warszawa, 1990. S. 21–22.

[23] O działalności Narodowej Demokracji na ziemiach wschodnich byłej Rzeczypospolitej pisali m.in.: T. Mistewicz, Zagadnienia rewindykacji terytorialnych

w ideologii polskiego ruchu nacjonalistycznego do roku 1918, “Dzieje Najnowsze” 1986. Nr 1; J. Jurkiewicz, Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905–1922, Poznań, 1983. S. 26–30; L. Wasilewski, Litwa i Białoruś. Przeszłość — teraźniejszość — tendencje rozwojowe, Kraków, 1912. S. 334–340; R. Wapiński, Narodowa Demokracja 1893–1939. Ze studiów nad dziejami myśli nacjonalistycznej, Wrocław 1980.

[24] S. Grabski, Pamiętniki, t. II. Do druku przygotował i wstępem opatrzył W. Stankiewicz, Warszawa, 1989. S. 173 (Związek Sowiecki formalnie jeszcze wówczas nie istniał, powstał w 1922 r.).

[25] “Nieformały” — kto wy?, “Nioman” 1988. Nr 6. S. 161, cyt za: W. Czarnou, Biełaruski nacyjanał-kansierwatyzm: prablemy i pierspiektywy, “Hramadzianskaja alternatywa. Hramadska-palityczny analityczny biuleteń” 1999. Nr 3. S. 12.

[26] A. Kisztymau, Listy Rosjanina Białorusina, w: Inna Białoruś. Historia — polityka — gospodarka. Przekład E. Komowska-Michalska, Warszawa, 1999. S. 170.

[27] M. Śliwiński, W. Czekman, Białoruś: ziemia niczyja?, “Obóz”, 1996. Nr 30. S. 26.

[28] Zob. L. Barszczewski, Suczasnaja forma biełaruskaj nacyjanalnaj idei i wyratawannie Biełarusi, “Hramadzianskaja alternatywa. Hramadska-palityczny analityczny czasopis”, 1999. Nr. 1. S. 28–29.

[29] J. Lichtarowicz, U. Iwanou, Biełaruskaja nacyja: mif albo reczaisnasć (jaszcze adzin pohlad na staruju prablemu), “Hramadzianskaja alternatywa. Hramadska-palityczny analityczny czasopis”, 1999. Nr. 1. S. 10.

[30] Materyjały pasiadżennja “kruhłaha stała” palitołahau: “Biełaruś: koniec 1980-ch hodow. Chożdienie po mukam ili…”, “Adkrytaje hramadstwa”, 1998. Nr 2. S. 32, cyt. Za: W. Czarnou, Biełaruski nacyjanał-kansierwatyzm: prablemy i pierspiektywy, “Hramadzianskaja alternatywa. Hramadska-palityczny analityczny biuleteń”, 1999. Nr. 3. S. 12.

Аляксандр Краўцэвіч (Гродна, Беларусь)

## Некалькі заўваг пра польскасць і беларускасць у гістарычным кантэксце

Паняцце нацыянальнай ідэі, дзеля абмеркавання якога сабраўся наш «круглы стол», надзвычай цяжка паддаецца вызначэнню, зрэшты, як большасць тэрмінаў, звязаных з вывучэннем адносін паміж людзьмі. Шматпланавасць і складанасць тэрміну «нацыянальная ідэя» відна ўжо з назваў раздзелаў праграмы нашай канферэнцыі, дзе выдзелены філасофска-метадалагічныя, культуралагічныя, грамадскія, гістарычныя яе аспекты. Яшчэ адным пацвярджэннем складанасці праблемы з'яўляецца тая акалічнасць, што ніхто з прысутных тут высокаадукаваных калег не «замахнуўся» на акрэсленне паняццяў «ідэя беларускасці» альбо «ідэя польскасці».

Напэўна, названы тэрмін можна аналізаваць, акрамя іншага, і ў кантэксце галоўнай стратэгічнай задачы, вырашэнню якой служыць нацыянальная ідэя, менавіта задачы выжывання пэўнай этнічнай супольнасці ў гістарычнай перспектыве. І адсюль вынікае адно з азначэнняў нацыянальнай ідэі, менавіта, як **праграмы выжывання нацыі**.

Гістарычная практыка паказала, што пры ўсёй індывідуальнасці і непаўторнасці гістарычных лёсаў розных этнасаў, механізмы рэалізацыі гэтай праграмы выжывання адныя і тыя ж для ўсіх народаў. Галоўным з гэтых механізмаў, сродкаў ці рычагоў можна лічыць дзяржаву. Вось і на нашым спатканні практычна ў кожным выступленні пра польскасць ці беларускасць гаворка ідзе аб польскай ці беларускай дзяржаве. Рызыкну нават удакладніць тэму нашай сустрэчы — «беларуская дзяржаўная ідэя і польская дзяржаўная ідэя».

Не выклікае сумнення прыналежнасць этнасу і дзяржавы да паняццяў аднаго класа, паколькі яны абодва звязаны з арганізацыяй жыццядзейнасці буйных чалавечых супольнасцей. Дзяржава — гэта арганізацыя больш позняя і больш эфектыўная ў выкананні гэтай функцыі. Узаемаадносіны паміж этнасам і дзяржавай — вялікая і складаная праблема, якая патрабуе дасканалага вывучэння іх гістарычнай практыкі.

Выкарыстанне дзяржаўнай арганізацыі для рэалізацыі нацыянальнай ідэі (такое разуменне функцыі дзяржавы сфарміравалася ў новы і найноўшы час) — справа адказная і няпростая, яна патрабуе асцярожнасці і ўмення ў кіраванні гэтым

наравістым канём. Калі параўнаць, то ўмелым вершнікам — кіраўніком дзяржавы — з'яўляецца нацыянальная эліта. Часам здараецца, што конь выходзіць з-пад кантролю вершніка. Пра гэта сведчыць прыклад сённяшняй Беларусі, дзе дзяржаўная арганізацыя толькі ў малой ступені (найперш, фактам свайго існавання) выступае як механізм рэалізацыі беларускай нацыянальнай ідэі ці праграмы выжывання беларускага этнасу. І, наадварот, прыклад суседняй Латвіі паказвае, як можна рэалізоўваць ідэю карэннай нацыі, нават ва ўмовах яе колькаснай меншасці ў краіне.

Асноўная праблема, драма і нават трагедыя беларускага этнасу, галоўная прычына ягонага глыбокага крызісу працягласцю больш чым у тры стагоддзі — страта нацыянальнай эліты. Страта праз паланізацыю XVII–XVIII стст. (больш добраахвотную), русіфікацыю ў XIX–XX стст. (больш прымусовую), праз фізічнае вынішчэнне ў сталінскіх засценках, праз выпустошванне савецкім таталітарызмам. Напэўна, многія з беларускіх адраджэнцаў зведалі пачуццё роспачы ад усведамлення безнадзейнасці высілкаў некалькіх пакаленняў беларускай інтэлігенцыі, многіх таленавітых і моцных людзей, калі ўсё, што яны рабілі, сплывала, як вада ў пясок, і кожная новая генерацыя пачынала ўсё ад пачатку, ад нуля.

Галоўная задача сённяшняга дня — выхаванне вершніка, беларускай нацыянальнай эліты, кіраўніка дзяржавы, носьбіта і рэалізатара нацыянальнай ідэі, працаўніка над паўнацэнным развіццём нацыянальнай эканомікі і культуры, выканаўцы праграмы выжывання нацыі.

Калі параўноўваць сённяшні стан беларускасці і польскасці, то розніца між імі ў поспехах і ступені рэалізацыі нацыянальнай ідэі. Калі Польшча працуе над узмацненнем сваёй эканамічнай і культурнай пазіцыі ў Еўропе і свеце, то надзённай задачай беларускага этнасу з'яўляецца элементарнае выжыванне ў бліжэйшай гістарычнай перспектыве.

Гістарычныя абставіны, наша суседства і суседства Расіі прычыніліся да актыўных беларуска-польскіх адносін, якія не заўсёды былі прыязнымі і добрасуседскімі, развіваліся часам у духу суперніцтва і барацьбы. Польскасць умацоўвала свае пазіцыі і за кошт беларушчыны.

Мне здаецца, што важнейшай справай сённяшняй і іншых такіх сустрэч з'яўляецца спрыянне пераўтварэнню барацьбы ў супрацоўніцтва, каб не паўтарылася практыка міжваеннага часу, якая пакінула нам у спадчыну ўзаемны недавер, што

выступае часта на ўзроўні падсвядомасці. Інерцыя той практыкі часам праяўляецца і сёння, напрыклад, у дзеяннях каталіцкага касцёла ў Беларусі. Мы павінны быць удзячныя польскім святарам-місіянерам, якія праводзяць вялікую работу па адраджэнню ў нашай краіне духоўнасці, найперш, духоўнасці хрысціянскай. Аднак здараюцца прыклады разумення дзейнасці касцёла як механізма ўзмацнення польскай прысутнасці ў нашай краіне. Прывяду адзін свежы прыклад. У газеце Гродзенскай каталіцкай епархіі «Слова Жыцця» ад 25 чэрвеня 2000 г. першы артыкул на першай старонцы пачынаецца з выдзеленага тлустым шрыфтам наступнага выказвання: «Не шкадуйце ахвяраў на будоўлю касцёла на Крэсах, бо Каталіцкі Касцёл на Крэсах у часы няволі ўратаваў нашу душу і мову польскую.

Хто любіць Айчыну, няхай ратуе Крэсы, каб сталі Польшчай не толькі геаграфічна, але мовай і духам.

Каталіцкі Касцёл на Крэсах — гэта праўдзівы КОР (Korpus Ochrony Pogranicza), ахоўнік польскай мовы і душы».

Трохі ачуўшыся ад шоку, пачаў чытаць далей і высветліў, што артыкул прысвечаны аднаўленню касцёла ў Капцёўцы пад Гродна, а тэкст, вынесены ў пачатак, гэта цытата са звароту да вернікаў камітэта будовы касцёла ў 1936 г. Тым не менш, узнікае пытанне, ці падзяляе кіраўніцтва касцёла гэтае выказванне ці палітычную праграму, змешчаную ў пачатку першай старонкі сваёй газеты?

З другога боку, у беларускай прэсе, а часам і ў гістарычных працах сустракаюцца непрыкрыта палонафобскія выказванні [1].

З уласнага вопыту пераканаўся, што гэтая інерцыя ўзаемнага недаверу адсутнічае сярод навуковай інтэлігенцыі. Наша задача — напрацоўка праграм, форм і метадаў польска-беларускага супрацоўніцтва на будучыню.

---

[1] Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прачытаць параграф, прысвечаны польска-савецкай вайне 1920 г. у сінтэзнай працы для студэнтаў і настаўнікаў: Ковкель И., Ярмусик Э. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени. Минск, 1998. С. 360–392.

Алесь Смалянчук (Гродна, Беларусь)

# Беларускі рух пачатку XX ст. і ідэя палітычнай нацыі

З'яўленне ідэі палітычнай нацыі ў грамадскім і палітычным жыцці Беларусі і Літвы непарыўна звязана з феноменам так званай краёвасці пачатку XX ст. Асноўным пастулатам краёвай ідэалогіі было сцвярджэнне, што ўсе карэнныя этнасы беларуска-літоўскага краю ўтвараюць адзіную нацыю, якую часта называлі «нацыяй літвінаў». Да гэтай нацыі належыць кожны, хто адчувае сябе грамадзянінам краю, незалежна ад этнічнасці, сацыяльнага паходжання і культурнай арыентацыі.

Ідэалогія краёвасці выразна супрацьстаяла этнічнаму нацыяналізму. Яна нарадзілася сярод літоўскіх і беларускіх палякаў, свядомасць якіх часта вызначалася формулай gente Lithuaniae, natione Polonus альбо gente Ruthenus, natione Polonus. Першымі з прапагандай краёвых поглядаў у друку выступілі Раман Скірмунт, Баляслаў Ялавецкі, Міхал Ромер, Канстанцыя Скірмунт і інш.

Адзінства ў разуменні краёвай ідэі не было. Краёвасць Міхала Ромера прадугледжвала зліццё ўсіх карэнных этнасаў краю і фарміраванне новай палітычнай нацыі. Раман і Канстанцыя Скірмунты ўспрымалі краёвасць як беларуска-літоўскі патрыятызм, дамінаванне агульнакраёвых інтарэсаў над патрэбамі асобных этнасаў і сацыяльных груп. Для Людвіка Абрамовіча краёвая ідэалогія зводзілася да добрасуседскага сужыцця ўсіх этнасаў краю. У масавай свядомасці большасці прадстаўнікоў мясцовай польскай грамадскасці, якая падтрымала краёўцаў, краёвасць трактавалася чыста прагматычна як тактычны сродак дзеля ўмацавання польскасці ў перыяд нацыянальна-культурнага адраджэння народаў краю. Пры гэтым рознагалоссі ўсе краёўцы ўспрымалі беларуска-літоўскі край як суб'ект гісторыі і працавалі над яго ператварэннем у суб'ект палітыкі. Іх палітычная канцэпцыя эвалюцыянавала ад патрабавання аўтаноміі «гістарычнай Літвы» з соймам у Вільні да яе дзяржаўнай незалежнасці [1].

Першыя кантакты беларускіх дзеячаў з краёўцамі адбываліся ўжо ў часы рэвалюцыі 1905–1907 гг. У № 46 ад 13(26).04. 1906 г. «Gazety Wileńskiej», кіраўніком якой з'яўляўся Міхал Ромер, быў надрукаваны артыкул Антона Луцкевіча, прысвечаны аграрнай праграме Беларускай Сацыялістычнай Грамады

(«Program agrarny»). А. Луцкевіч схаваў сваё аўтарства пад псеўданімам Ян Мялешка.

Кантакты прыкметна ўзмацніліся ў 1910 г., калі ў Вільні ўзнікла масонская ложа «Лучнасць», сярод заснавальнікаў якой былі браты Луцкевічы. Гэта ложа аб'ядноўвала прадстаўнікоў дэмакратычных плыняў польскага, беларускага, літоўскага, яўрэйскага і рускага этнасаў. Большасць з іх падзяляла краёвыя погляды. У 1911 г. у «Лучнасць» быў прыняты Міхал Ромер, які хутка стаў адным з прызнаных масонскіх кіраўнікоў [2]. Дзякуючы яго асабістым якасцям, уменню пераканаць і павесці за сабой, віленскія масонскія ложы (у 1911 г. была створана ложа «Літва», у 1914 г. — ложа «Беларусь») сталі моцнымі цэнтрамі прапаганды краёвасці і ідэі палітычнай нацыі ў якасці яе найважнейшай састаўной часткі [3].

Аналіз публікацый Антона і Івана Луцкевічаў дазваляе сцвярджаць, што ў гэты перыяд дзеячы беларускага руху падзялялі асноўныя пастулаты краёвасці. Магчыма паслярэвалюцыйная палітычная рэакцыя, якую звычайна звязваюць з дзейнасцю вядомага расійскага рэфарматара і кіраўніка ўрада Пятра Сталыпіна, разуменне ўнутранай слабасці палітычнага беларускага руху спрыялі адыходу яго кіраўніцтва ад пэўнага сацыяльнага і этнічнага радыкалізму. Можна сцвярджаць, што ў перыяд з 1907 па 1916 гг. адбывалася лібералізацыя беларускага руху і перамяшчэнне галоўнага акцэнту дзейнасці з палітыкі ў культурна-асветніцкую галіну. Кіраўнікі беларускага руху (браты Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі) не толькі прынялі ідэю палітычнай нацыі, але і актыўна яе прапагандавалі.

На пачатку лістапада 1911 г. на сустрэчы з удзелам Івана Краскоўскага, Антона Луцкевіча, Браніслава Крыжаноўскага, Зыгмунта Нагродскага і Міхала Ромера была выказана думка пра выданне ў Вільні рускамоўнага дэмакратычнага штотыднёвіка краёвага накірунку [4]. Мэтай выдання была прапаганда краёвай ідэалогіі ў яе ліберальна-дэмакратычным варыянце сярод рускай грамадскасці Вільні. Аднак непасрэдных вынікаў гэтая размова не мела. Толькі ўвосень 1912 г. напярэдадні выбараў у Дзяржаўную думу ідэя пачала набываць канкрэтныя формы. На гэты раз ініцыятыву ўзяў у свае рукі Антон Луцкевіч.

18.09(1.10).1912 г. выйшаў першы нумар «Вечерней газеты». Падпісаў яго да друку ў якасці рэдактара Ф. Хатэнка. Але сапраўдным кіраўніком газеты і аўтарам большасці «перадавых» артыкулаў быў А. Луцкевіч. Пра гэта сведчаць шматлікія запісы ў дзённіку М. Ромера. Апроч таго, сапраўднага кіраўніка газеты

заўважылі агенты Дэпартамента паліцыі [5]. «Вечерняя газета» адразу прыцягнула ўвагу віленскай грамадскасці. Гэтаму спрыяў высокі ўзровень публіцыстыкі.

Прапаганда краёвасці і ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі, якую разгарнула «Вечерняя газета», адыграла сваю ролю падчас абрання ўдзельнікаў віленскага губернскага выбарчага сходу па так званай «рускай курыі». Газета, сапраўды, паспрыяла распаўсюджванню сярод рускай грамадскасці Вільні ідэй ліберальных дэмакратаў. Гэта паўплывала і на выніку выбараў. Адначасова высветлілася, што газета знайшла свайго чытача, і Антон Луцкевіч вырашыў працягваць выданне. Магчыма ўжо ў гэты час у яго ўзнік план цэнтралізацыі віленскага дэмакратычнага і краёвага друку, пра які пазней згадаў у сваім Дзённіку М. Ромер [6].

Істотнай часткай плана было выданне штодзённай польскамоўнай газеты. Гэты праект А. Луцкевіч збіраўся рэалізаваць у цесным кантакце з польскімі дэмакратамі. Аднак перамовы з групай польскіх віленскіх дэмакратаў-краёўцаў (галоўным апанентам А. Луцкевіча быў Л. Абрамовіч) закончыліся безвынікова. Беларусы вырашылі дзейнічаць самастойна.

8(21).12.1912 г. выйшаў першы нумар «Кур'ера краёвага». Яго рыхтаваў Язэп Манькоўскі, які даволі актыўна ў гэты час працаваў у асяроддзі віленскіх беларусаў, а праграмны артыкул напісаў Антон Луцкевіч [7]. М. Ромер досыць высока ацэньваў узровень публіцыстыкі першых нумароў «Кур'ера». Галоўнай прычынай поспеху новай «польскай» газеты ён лічыў ідэйнае кіраўніцтва з боку Антона Луцкевіча і непасрэдны ўдзел беларускага дзеяча ў падрыхтоўцы яе нумароў да выдання. У сваіх ацэнках «Кур'ера» М. Ромер неаднаразова звяртаў увагу на ролю А. Луцкевіча: «Адным з галоўных, хоць звонку непрыкметных супрацоўнікаў газеты, з'яўляецца Антон Луцкевіч, адзін са стаўпоў «Нашай Нівы». Гэта, магчыма, самы дзелавіты работнік і самая здольная галава беларускага народнага руху. Адначасова ён рэдагуе «Вечернюю газету». Антон Луцкевіч трымаецца трохі ў цені, не становіцца на чале «Кур'ера краёвага», але фактычна выконвае партыю першай скрыпкі. Ён аказвае рашаючы ўплыў на кірунак і арганізацыю газеты» [8].

Такім чынам, у канцы 1912 г. пад кантролем віленскага беларускага кола знаходзіліся чатыры выданні: два беларускія штотыднёвікі — «Наша Ніва» і «Саха», адно польскамоўнае — штодзённая газета «Кур'ер краёвы» і адно рускамоўнае — штодзённая «Вечерняя газета».

Што ўяўляла пазіцыя гэтых выданняў па асноўных пытаннях жыцця беларуска-літоўскага краю?

У праграмных артыкулах першых нумароў «Вечерней газеты» і «Кур'ера краёвага» А. Луцкевіч сфармуляваў галоўныя задачы выданняў, якія цалкам адпавядалі дэмакратычнаму варыянту краёвасці і адвяргалі канцэпцыю этнічнага нацыяналізму.

«Вечерняя газета» № 1 ад 18.09(1.10).1912 г.: «У нас ніякім чынам нельга зыходзіць з інтарэсаў якой-небудзь адной нацыянальнай групы. Ва ўмовах разнастайнасці нацыянальнага складу насельніцтва трэба ўвесь час мець на ўвазе інтарэсы краю, як адзінага цэлага. Толькі ў гэтым выпадку магчыма нармальнае развіццё кожнай асобнай народнасці. Усведамленне, што ўсе мы, жыхары гэтай зямлі, з'яўляемся грамадзянамі Краю — вось нашая зыходная кропка пры высвятленні патрабаванняў розных груп насельніцтва». Поўнае задавальненне і нацыянальных і сацыяльных патрабаванняў А. Луцкевіч звязваў з устанаўленнем дэмакратычнага ладу. Пад апошнім разумелася правядзенне ў жыццё ў поўным аб'ёме «вялікіх палажэнняў», абвешчаных яшчэ Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г.».

У праграмным артыкуле першага нумара «Кур'ера» падкрэслівалася небяспека ваяўнічага шавінізму, які «ўносіць у народныя масы ўзаемную нянавісць і ўнутраную барацьбу, пагражае распадам краю і стратай ім магчымасці абараняцца ад людзей, якія імкнуцца знішчыць на гэтай зямлі ўсялякае пачуццё асобнасці». Між тым, «у Краі, дзе побач з літоўцам жыве паляк, побач з беларусам — яўрэй, у Краі, няшчасны лёс якога прадвызначыў ягонае адставанне і пазбавіў магчымасці свабоднага развіцця, няма месца для ўнутранай барацьбы. А. Луцкевіч заклікаў усіх «грамадзян Краю» да працы на ягоную карысць і на карысць прыгнечанага народа.

Тэрмін «грамадзянін Краю», адзін з асноўных з пункту гледжання канцэпцыі палітычнай нацыі, шырока ўжываўся на старонках «Кур'ера» і «Вечерней газеты». Аўтары публікацый даводзілі, што жыццёва важныя для краю пытанні павінны вырашацца з улікам інтарэсаў усіх этнасаў Беларусі і Літвы [9], асуджалі велікарускі і велікапольскі шавінізм [10], заяўлялі пра неабходнасць барацьбы з праявамі шавінізму сярод беларусаў і літоўцаў [11], выкрывалі сутнасць дзейнасці так званага «Белорусского общества» як арганізацыі велікарускіх шавіністаў у беларускай «вопратцы» [12] і інш.

Асновай краёвай згоды лічылася супрацоўніцтва дэмакратычных сіл усіх этнічных рухаў [13]. Краёвасць досыць натуральна

прыводзіла да дэмакратычных поглядаў: «Усё больш ясным становіцца той шлях, які мясцовым рускім людзям падказвае само жыццё. Як грамадзяне краю мы павінны ўважыць яго карэннае насельніцтва, прыслухацца да ягонага голасу і пажаданняў, лічыць яго інтарэсы сваімі інтарэсамі і працаваць на агульную карысць» [14]. У сваю чаргу, дэмакратызм, які зыходзіў з павагі да народных патрабаванняў, непазбежна нараджаў краёвую пазіцыю [15].

Абодва выданні пашыралі ідэалогію краёўцаў-дэмакратаў сярод грамадства Беларусі і Літвы. «Вечерняя газета» рабіла гэта сярод рускіх, але не пакідала цалкам па-за ўвагай і палякаў. У шэрагу артыкулаў апошніх спрабавалі пераканаць у тым, што толькі іх шчыры паварот да дэмакратыі можа гарантаваць будучыню польскай грамадскаці Беларусі і Літвы [16].

А вось для «Кур'ера краёвага» пашырэнне дэмакратычных поглядаў сярод польскай грамадскасці было адной з галоўных задач. Антон Луцкевіч у сваіх артыкулах даволі часта апеляваў да гістарычных традыцый: «З паняццем польскасці заўсёды звязвалася паняцце свабоды», «Як некалі з іменем паляка атаясамлівалася вольнасць, так зараз наша (польская. — *А. С.*) нацыянальная будучыня звязана з дэмакратыяй» [17].

А што ж «Наша Ніва»? Нават павярхоўны аналіз публікацый галоўнай беларускай газеты ўказвае на тэматычны паралелізм з матэрыяламі «Кур'ера краёвага» і «'Вечерней газеты». У першую чаргу, гэта прапаганда краёвай ідэалогіі ў яе дэмакратычным варыянце і барацьба з этнічным шавінізмам [18]. Падчас выбарчай кампаніі ў IV Дзяржаўную думу «Наша Ніва» падтрымала кандыдатаў, якіх адстойвала «Вечерняя газета». У адным з артыкулаў «Нашай Нівы» адзначалася: «[...] Мы, беларусы, можам верыць толькі шчырым расійскім прагрэсістам, каторыя зрадніліся з нашым Краем, лічаць сябе грамадзянамі нашай старонкі» [19]. Усе выданні вялі сумесную барацьбу супраць вялікапольскага і вялікарускага шавінізму. Яны разам давалі адпор нападкам шавіністычнага друку. У першую чаргу, гэта тычылася «Виленского вестника» і «Гонца цодзеннэго» [20].

Бадай, самыя цікавыя матэрыялы "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага" - гэта матэрыялы, якія распавядалі пра беларускі рух. Яны займалі значнае месца ў абодвух выданнях. Ужо ў гэтым праяўляўся "беларускі ўхіл" краёўца Антона Луцкевіча. Публікацыі абаранялі "Нашу Ніву" і ўвесь беларускі рух ад абвінавачванняў вялікарускіх і вялікапольскіх шавіністаў, якія імкнуліся

давесці, што няма ніякага беларускага руху, а ёсць толькі "польская" або, адпаведна, "руская" інтрыга".

І рускамоўнае, і польскамоўнае выданні імкнуліся выклікаць сімпатыі да беларускага руху. «Вечерняя газета» асцярожна згадвала пра мясцовыя беларускія карані большасці рускай грамадскасці краю [22]. «Кур'ер краёвы» заклікаў шукаць згоду і паразуменне з беларусамі. Пры гэтым падкрэсліваліся дэмакратычныя тэндэнцыі ў беларускім руху: «Шчыры дэмакратызм беларускага руху… ягоная лаяльнасць у адносінах да суграмадзян іншых нацыянальнасцяў — гэта гарантыя, што нашы імкненні знойдуць жывы водгук сярод беларусаў» [23].

Такім чынам, у перыяд 1911–1915 гг. сканцэнтраваны ў руках беларусаў друк у дачыненні да нацыянальнай праблемы выразна дэманстраваў сваю прыхільнасць да ідэі палітычнай нацыі. Але паўстае пытанне, наколькі шчырымі былі беларускія дзеячы ў сваёй прапагандзе ідэі палітычнай нацыі або краёвасці ў цэлым?

Аналіз крыніц, якія маюцца ў нашым распараджэнні, дазваляе гаварыць пра выключна прагматычнае выкарыстанне беларусамі краёвай ідэалогіі. У краёвасці яны бачылі сродак, які дазволіць узмацніць пазіцыі беларускага этнасу ў нацыянальна-культурным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі і Літвы. Так, напрыклад, прапаганда на старонках «Кур'ера» неабходнасці паразумення палякаў з беларусамі аргументавалася не толькі інтарэсамі сумеснай барацьбы з велікарускім шавінізмам [24]. Аўтары публікацый заявілі пра адсутнасць выразных перспектыў далейшага развіцця польскага руху ў беларуска-літоўскім краі [25]. Тут відавочны «беларускі ўхіл» краёвасці Антона Луцкевіча і іншых дзеячаў нашаніўскага кола. Беларуская пазіцыя далёка не заўсёды адпавядала разуменню краёвасці М. Ромерам, найбольш паслядоўным прыхільнікам ідэі палітычнай нацыі.

Сутнасць беларускага разумення краёвасці досыць дакладна вызначылі апаненты Луцкевічаў са штотыднёвіка «Пшэглёнд Віленьскі», які ўзначальваў Л. Абрамовіч. Апошні сцвярджаў, што пазіцыя беларусаў грунтавалася на адсутнасці веры ў магчымасць захавання польскасці ў беларуска-літоўскім краі. Да гэтага трэба дадаць перакананне кіраўнікоў беларускага руху, што беларускія і літоўскія палякі з'яўляюцца толькі нашчадкамі паланізаваных літоўцаў і беларусаў. Такая пазіцыя нараджала патрабаванні, каб польская грамадскасць працавала дзеля развіцця свядомасці беларусаў і літоўцаў. «Пшэглёнд» катэгарычна

адвяргаў падобныя заявы. Ён неаднаразова абвінавачваў «Кур'ер» у «пабочных уплывах» [26]. Аднак раскрываць таямніцу беларускага польскамоўнага выдання палякі не сталі.

«Беларускі ўхіл» можна заўважыць і ў асобных артыкулах «Вечерней газеты»: «Справа культуры, справа прагрэсу настолькі важная, што яе павінен падтрымліваць кожны грамадзянін Краю. Тут няма месца для меркаванняў нацыянальнага эгаізму: хто можа, той павінен садзейнічаць культурным намаганням сваіх слабейшых суседзяў, з якімі яго моцна звязаў гістарычны ход падзей» [27].

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што беларусы нашаніўскага кола і, у першую чаргу, А. Луцкевіч разумелі краёвасць як сужыцце розных этнасаў краю. У гэтым сужыцці яны імкнуліся забяспечыць за ўласным этнасам лепшыя ўмовы. Дарэчы, гэта набліжала іх пазіцыю да пазіцыі групы Людвіка Абрамовіча, але гэтае ж падабенства непазбежна рабіла іх апанентамі. А. Луцкевіч спадзяваўся, што прапаганда ідэі палітычнай нацыі на польскай і рускай мовах паспрыяе далучэнню да беларускага руху як русіфікаваных, так і паланізаваных беларусаў і тым самым пашырыць яго сацыяльную базу.

Міхал Ромер характарызаваў беларускія «прэтэнзіі» як праявы этнічнага нацыяналізму [28]. Але пры гэтым галоўны ідэолаг краёвасці быў упэўнены, што А. Луцкевіч і яго сябры ў рэшце рэшт зразумеюць польскую пазіцыю і пагадзяцца з тым, што палякі Беларусі і Літвы маюць поўнае права на развіццё ўласнай культуры і на ўдзел разам з літоўцамі і беларусамі ў вызначэнні будучыні краю.

Надзея М. Ромера была дастаткова абгрунтаванай. Відавочна, што нашаніўскае беларускае кола ў гэты час моцна спадзявалася на пазітыўныя вынікі супрацоўніцтва з польскімі, літоўскімі і яўрэйскімі краёўцамі-дэмакратамі. Дзеля згоды А. Луцкевіч быў гатовы пайсці на пэўныя ўступкі. Магчыма, ён разлічваў, што пазіцыя М. Ромера будзе пашырацца сярод грамадскасці. У тым, што гэта прынясе вялікую карысць як беларускаму руху, так і ўсяму краю, беларускі дзеяч быў упэўнены.

Але надзеі не спраўдзіліся. І ў пачатку 1915 г. А. Луцкевіч на старонках «Нашай Нівы» выступіў з рэзкай крытыкай «нашых» палякаў: «Нашы» палякі-інтэлігенты кажуць, што яны маюць поўна работы «для сваіх» — для «польскага сялянства і пралетарыяту» на нашай зямлі. Але ж польскага «дэмасу» — на смех, малая жменя. А поруч з гэтай жменяй мільёны цёмных і галодных беларускіх сялян, каторыя блізка не маюць йшчэ сваёй

інтэлігенцыі, для каторых няма каму працаваць... Працаваць для тых мільёнаў — гэта для нашых палякаў грэх і здрада, хоць колькі ж між іх сыноў таго ж беларускага народа! [...] Яны не разумеюць, што прайшоў час панавання над намі і трэба цяпер адслужыць нашай старонцы, трэба не толькі называцца, але і быць грамадзянамі, трэба карміць галоднага і асвяшчаць цёмнага селяніна не толькі за тым, што ён — «свой», што ён пераробіцца на паляка, але затым, што гэта святая павіннасць. А раз гэта павіннасць, а не ласка, дык і вучыць беларусаў трэба не так, як хоча вучыцель, а так, як гаворыць народ, каторы, захаваўшы сваю мову праз сотні гадоў, праявіў ясна сваё жаданне заставацца беларусам» [29].

Гэтая крытыка не мела дачынення да М. Ромера і прыхільнікаў ягонай краёвай пазіцыі. У наступным нашаніўскім артыкуле А. Луцкевіч адзначыў, што «поруч з «прыгоншчыкамі» ў нашай старонцы ёсць людзі, каторыя, баронячы сваю польскую культуру, не забываюць, што яны тутэйшыя грамадзяне, што і на іх ляжыць павіннасць памагаць галодным, асвяшчаць цёмных людзей — нягледзячы, якой яны нацыі і веры. [...]

Мы верым, што сілы польскай дэмакратыі ўзрастуць, калі над зямлёй Беларусі засвеціцца зорка лепшай будучыні. А шчыры дэмакратызм створыць той залаты мост, каторы з'яднае ўрэшце народы нашага краю ў адну вялікую згодную сям'ю і каторы польскія нацыяналісты цяпер не даюць збудаваць» [30].

Зразумець самакаштоўнасць ідэі палітычнай нацыі ва ўмовах культурнага адраджэння этнасаў беларуска-літоўскага краю ва ўмовах абвастрэння міжэтнічных адносін было вельмі няпроста. Даволі прагматычнае стаўленне беларусаў да гэтай ідэі ў пачатку XX ст. не павінна здзіўляць. Аналагічна гэтую ідэю трактавала большасць польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх дзеячаў.

Адным з апошніх актаў супрацоўніцтва краёўцаў было ўтварэнне ў канцы 1915 г. ва ўмовах Вільні, акупаванай Германіяй, часовай Рады канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага. Фактычна Рада выступала за дзяржаўную незалежнасць «гістарычнай Літвы». Новаўтвораная дзяржава павінна была гарантаваць усім яе этнасам права на свабоднае культурнае развіццё. Гэтая арганізацыя аб'яднала дзеячаў розных этнічных рухаў, а ініцыятыва яе стварэння належала беларусам. Аднак выпрабавання часам яна не вытрымала. Абвастрэнне міжэтнічных адносін (асабліва польска-літоўскіх), да чаго сваю руку прыклалі і прадстаўнікі германскай акупацыйнай адміністрацыі, хутка разбурылі гэтую трохі рамантычную ідэю. Негатыўную ролю

адыграла таксама радыкалізацыя беларускага руху, якая хутка адбывалася пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі. Беларуская Сацыялістычная Грамада, што адрадзілася ў 1917 г., успрымала беларускі этнас як сялянска-рабочы. Прадстаўнікам іншых сацыяльных колаў (асабліва землеўладальнікам) было амаль немагчыма заваяваць давер сацыялістаў.

Аднак віленскія беларускія дзеячы, магчыма, па прычыне слабасці беларускага руху вельмі доўга захоўвалі вернасць краёвай ідэалогіі. Так, ідэя дзяржаўнасці гістарычнай Літвы яшчэ ў 1917 г. дамінавала ў беларускім руху на захад ад лініі фронта. Толькі ў пачатку 1918 г. беларусы былі вымушаны канчаткова ад яе адмовіцца. Сваю ролю адыграла прызнанне Германіяй незалежнасці «этнаграфічнай» Літвы са сталіцай у Вільні і імперскія амбіцыі палітыкаў новай Польшчы, якая хутка ўмацоўвала свой дзяржаўны суверэнітэт і разглядала беларускія землі як сферу свайго палітычнага дамінавання.

Такім чынам, у пачатку XX ст. у сілу неспрыяльных унутраных і знешніх абставін ідэя палітычнай нацыі не стала падмуркам беларускага руху, хаця вельмі актыўна выкарыстоўвалася беларусамі. Між тым гісторыя Еўропы ўсяго XX ст. выразна засведчыла перспектыўнасць менавіта дактрыны палітычнага нацыяналізму. Галоўным крытэрыем нацыянальнай прыналежнасці паступова сталася ўжо не этнічнасць, а грамадзянства. Падобны падыход дазволіў у многіх краінах звесці да мінімуму этнічныя канфлікты, паспрыяў фарміраванню грамадзянскай супольнасці.

Аднак гэты вопыт не быў выкарыстаны беларускімі адраджэнцамі 90-х гг. XX ст. Кіраўніцтва Беларускага народнага Фронту актыўна выкарыстоўвала ідэалогію этнічнага, а не палітычнага нацыяналізму, што прыкметна абмежавала магчымасці беларускага руху. У канцы нашага стагоддзя прапаганда этнічнага нацыяналізму непазбежна робіць ягоных прыхільнікаў грамадскімі маргіналамі. У той жа час ідэалогія палітычнага нацыяналізму асабліва ва ўмовах, калі ў Беларусі працягваецца працэс фарміравання беларускай палітычнай нацыі, калі этнічная свядомасць саміх беларусаў абсалютна пазбаўлена этнацэнтрызму, дае пэўны шанс завяршыць працэс беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння ўтварэннем незалежнай дэмакратычнай беларускай дзяржавы.

---

[1] Смалянчук А. “Краёвасць” у беларускай і літоўскай гісторыі // Бел. гіст. Агляд. 1998. Т. 4. Сш. 1–2 (6–7).

[2] Ромер М. Дзённік. Аддзел рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы. Т. 4. С. 403.

[3] Смалянчук А. З гісторыі віленскага масонства пачатку XX ст. // Спадчына. 1998. № 5.

[4] Ромер М. Дзённік. Т. 2. С. 82. Запіс ад 6 (19). 11. 1911 г.

[5] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 102, асобы аддзел, 1913.

[6] Ромер М. Дзённік. Т. 2. С. 435.

[7] Тамсама. С. 450

[8] Тамсама. Т. 3. С. 61.

[9] Напр., Генрык Букавецкі [А. Луцкевіч]. Прынцыповае пытанне // Кур'ер краёвы. 1912. № 19; б/п [А. Луцкевіч?]. Одна из причин трений // Вечерняя газ. 1913. № 337 і інш.

